**АДУКАЦЫЯ НА ПРАЦЯГУ ЖЫЦЦЯ**
Гутарка з дэканам факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Наталляй МАНЦУРАВАЙ
Стар. 2

**НЕ ТОЛЬКІ НАВУЧЫЦЬ, АЛЕ І ПРАЦАЎЛАДКАВАЦЬ**
У БДУ абмеркавалі перспектывы выпускнікоў
Стар. 3

**КАЛЫСКА ХАРАКТАРАЎ**
Да года малой радзімы вядомыя асобы БДУ ўспамінаюць родныя мясціны свайго дзяцінства
Стар. 4–5

**ЯК ЗМЯНЯЕЦЦА АДУКАЦЫЙНАЕ АСЯРОДДЗЕ**
Гутарка з загадчыцай кафедры друкаваных СМІ і вэб-журналістыкі Святланай ХАРЫТОНАВАЙ
Стар. 6

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

25 чэрвеня 2019 года, № 9 (2215)

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт значна пашырыць супрацоўніцтва з кітайскімі ўстановамі адукацыі. Перспектывы развіцця партнёрскіх адносін і рэалізацыю стратэгічна важных беларуска-кітайскіх праектаў абмеркавала дэлегацыя БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём падчас візіту ў Кітай. Праграма наведвання ўсходняй краіны ўключала шматлікія сустрэчы з кіраўніцтвам шэрагу кітайскіх устаноў.



*Рэктар ДПУ Го Дунмін з рэктарам БДУ Андрэем Каралём*

# БДУ ў Кітаі: ад Пекіна да Даляня

### *Навуковы цэнтр з Пекінскім універсітэтам*

Прадстаўнікі БДУ наведалі Пекінскі ўніверсітэт, дзе быў падпісаны мемарандум аб паразуменні. Гэты дакумент надасць міжуніверсітэцкаму партнёрству афіцыйны статус па ўмацаванні і развіцці міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі і тэхналогій. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі магчымасць адкрыцця на базе Пекінскага ўніверсітэта навуковага цэнтра і цэнтра вывучэння Беларусі. Дзейнасць структур дазволіць умацаваць адносіны паміж краінамі ў галіне адукацыі, культуры і навукі, а таксама будзе садзейнічаць распаўсюджанню беларускай культуры, мовы і літаратуры ў КНР.

### *РІК імя Канфуцыя атрымаў права на атэстацыю перакладчыкаў*

У выніку перамоў з кіраўніцтвам Нацыянальнага цэнтра тэсціравання і ацэнкі перакладчыкаў Упраўлення па справах выдання і распаўсюджання літаратуры на замежных мовах КНР Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя (РІКК) БДУ атрымаў права правядзення міжнароднага кваліфікацыйнага іспыту для перакладчыкаў (CATTI) у моўнай пары „руская - кітайская“. Бакі разгледзелі асноўныя арганізацыйныя пытанні і падпісалі дадатковае пагадненне. Такім чынам, РІКК стаў першай у свеце замежнай арганізацыяй па прыёме кваліфікацыйнага іспыту для перакладчыкаў.

### *Сумесная падрыхтоўка кадраў з Універсітэтам Цінъхуа*

Адбылося наведванне аднаго з вядучых тэхнічных ВНУ Кітая Універсітэта Цінхуа. Тут дэлегацыя БДУ азнаёмілася з дзейнасцю навукова-даследчай лабараторыі, якая займаецца вывучэннем фізічных уласцівасцяў нанаматэрыялаў. Бакі выказалі ўзаемную зацікаўленасць у правядзенні калектыўных даследаванняў у галіне вывучэння нанавугляродных матэрыялаў і разгледзелі перспектывы сумеснай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

### *Даследаванні з Пекінскім педагагічным універсітэтам*

Падчас наведвання Пекінскага педагагічнага ўніверсітэта і Навукова-даследчага інстытута рынку ў стадыі развіцця былі вызначаны асноўныя кірункі сумеснага правядзення навуковых даследаванняў па актуальных праблемах беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

### *Адкрыццё навукова-інавацыйнага цэнтра ДПУ-БДУ*

Даляньскі політэхнічны ўніверсітэт (Dalian University of Technology, ДПУ) з'яўляецца стратэгічным партнёрам БДУ па розных кірунках з 2005 года. Актыўна развіваецца дзейнасць па сумеснай падрыхтоўцы студэнтаў. У 2017 годзе быў адкрыты Сумесны інстытут ДПУ-БДУ, а з верасня бягучага года адбудзецца першы набор беларускіх навучэнцаў у Сумесны інстытут БДУ-ДПУ. Вынікі працы за мінулы навучальны год, план на найбліжэйшы перыяд і кадравыя пытанні былі разгледжаны падчас правядзення справаздачнага пасяджэння кітайска-беларускага інстытута. Акрамя таго, адбылося падпісанне палажэння пра Сумесны інстытут БДУ-ДПУ і сцвярджэнне складу членаў савета. Дэталёва было прапрацавана пытанне пашырэння далейшай сумеснай дзейнасці. Рэалізацыя дадзенага намеру магчымая шляхам адкрыцця сумесных магістратуры і новых спецыяльнасцяў – «Фатонікі» і «Сусветнай эканомікі».

Наведванне ДПУ ўключала правядзенне гадавога пасяджэння савета РІКК БДУ за 2018-2019 гады. У ліку дасягненняў за гэты перыяд былі вылучаны: павелічэнне колькасці слухачоў кітайскай мовы, актыўная падрыхтоўка школьных настаўнікаў кітайскай мовы, правядзенне даследаванняў па тэматыцы сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця КНР, умацаванне фінансавага стану РІКК БДУ.

Таксама, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй Кароль выступіў з дакладам «Тэорыі і ідэі рэфармавання ўніверсітэтаў» на форуме рэктараў, прысвечаным святкаванню 70-годдзя ДПУ. Удзельнікамі ўрачыстай падзеі сталі рэктары вядучых кітайскіх і замежных ВНУ, акадэмікі Кітайскай акадэміі навук, вядомыя навукоўцы, кіраўніцтва правінцыі Ляанін і г. Далянь.

Заключным мерапрыемствам стала адкрыццё навукова-інавацыйнага цэнтра ДПУ-БДУ, дзе плануецца арганізоўваць навуковыя даследаванні і практыку студэнтаў Сумеснага інстытута ДПУ-БДУ.

Завяршыўся візіт у Кітай наведваннем Даляньскага ўніверсітэта замежных моў з мэтай умацавання навучальна-метадычнай працы і якасці выкладання кітайскай мовы ў БДУ. Дасягнуты дамоўленасці пра накіраванне ў РІКК БДУ кітайскага прафесара для забеспячэння навучальнага працэсу выкладання кітайскай мовы.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

**ЗВАННЯ «ВЫДАТНІК АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»** ганараваны прафесар кафедры тэорыі функцый механіка-матэматычнага факультэта **Наталля Броўка** і намеснік дэкана фізічнага факультэта па вучэбнай рабоце **Мікалай Гарбачук.** Найвышэйшая ўзнагарода Міністэрства адукацыі Беларусі прысуджана ім за шматгадовую плённую навукова-педагагічную працу, высокі ўзровень прафесійнага майстэрства, значны ўнёсак у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**ПРЫЯРЫТЭТНЫЯ КІРУНКІ СУПРАЦОЎНІЦТВА** абмеркавалі кіраўнікі БДУ і Універсітэта Цінхуа (КНР).

Кітайскія госці наведалі вядучую ВНУ Беларусі ўпершыню. Ім распавялі пра адукацыйную, навукова-тэхнічную дзейнасць БДУ і дасягненні ўніверсітэта ў касмічнай, ядзернай, хімічнай галінах. Кітайскіх калег зацікавілі распрацоўкі ў сферы графену, высокіх энергій, рабатызацыі і харчовай прамысловасці.

Былі абмеркаваны перапажныя кірунку супрацоўніцтва ў галіне адукацыі. Акцэнт быў зроблены на падрыхтоўцы аспірантаў і магістрантаў па праграмах прыродазнаўчага профілю. Адной з ініцыятыў стала сумесная падрыхтоўка студэнтаў на другой ступені па праграме «1+1». Перспектыўнымі былі вызначаны сумесныя даследаванні ў сферы «цвёрдых» тэхналогій і арганізацыя на базе БДУ летніх школ для кітайскіх навучэнцаў.

**Даведка.** Універсітэт Цінхуа заснаваны ў 1911 годзе. З'яўляецца найбуйнейшай і адной з самых прэстыжных вышэйшых навучальных устаноў у КНР. Размешчаны на паўночным захадзе Пекіна. Сёння ў ім праходзяць навучанне каля 47 тысяч студэнтаў, з іх каля 3000 – замежнікі. У структуру ўніверсітэта ўваходзяць 20 інстытутаў і 58 факультэтаў.

Паводле рэйтынгу QS Універсітэт Цінхуа размешчаны на 17 месцы ў свеце. Рэгулярна займае першае месца ў нацыянальным рэйтынгу ўніверсітэтаў КНР.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
25 чэрвеня 2019 года, № 9 (2215)

# Адукацыя на працягу ўсяго жыцця





*30 мая былі ўручаны сертыфікаты ўдзельнікам тэматычнага семінара «Камунікатыўная кампетэнтнасць урача». Навучанне прайшлі 17 урачоў установы аховы здароўя «Гарадская клінічная бальніца хуткай медыцынскай дапамогі»*



*Курсы павышэння кваліфікацыі куратараў навучальных груп па адукацыйнай праграме «Выхаваўчая работа куратара БДУ: псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя аспекты»*



*З 12 па 17 лістапада для кіраўніцкіх работнікаў Шэньянскага ўніверсітэта (КНР) праведзены навучальныя курсы «Мадэрнізацыя вышэйшай адукацыі: традыцыі і наватарства»*



*Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі «Суправаджэнне інтэрнэт-СМІ»*

Сёння адзін з галоўных трэндаў у сферы адукацыі – бесперапыннае навучанне. У ВНУ з'яўляецца новая задача: не толькі выпускаць запатрабаваных спецыялістаў, але і дапамагаць ім увесь час удасканальваць свае веды і навыкі. У БДУ дадатковай адукацыяй дарослых займаецца факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. З яго дэканам **Наталляй МАНЦУРАВАЙ** мы пагаварылі пра запыты рынку працы, перспектыўныя кірункі перападрыхтоўкі, запатрабаваныя адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі і навучальных курсаў.



## Ад павышэння кваліфікацыі да змены прафесіі

– Факультэт займаецца перападрыхтоўкай (цяпер мы прапануем сем спецыяльнасцяў), арганізуе праграмы павышэння кваліфікацыі і навучальных курсаў, да якіх адносяцца як кароткатэрміновыя – семінары, так і працяглыя – напрыклад, моўныя курсы. У гэтым кірунку ў нас прадстаўлена даволі шырокая «лінейка»: англійская (у тым ліку для IT-спецыялістаў і для бізнес-камунікацыі), нямецкая, італьянская, французская, польская, арабская, а з верасня плануем запусціць курс па вывучэнні хіндзі.

За гэты год мы пашырылі супрацоўніцтва з падраздзяленнямі, і да нашых асноўных партнёраў – журфака, філфака, факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі, упраўлення па рабоце з персаналам і ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю – далучыліся яшчэ некалькі факультэтаў. Так, праводзіліся новыя праграмы з ФРКТ, эканамфакам, ФМА, ФСК. Акрамя таго, у найбліжэйшай перспектыве запланаваны праграмы з фізфакам, гістфакам і ўпраўленнем міжнародных сувязяў.

## Ад студэнтаў да цэлых кампаній

– Асноўныя слухачы нашага факультэта – спецыялісты і кіраўнікі, якія хочуць павысіць сваю кваліфікацыю, атрымаць новыя веды. У навучальных курсах бяруць удзел і студэнты. Напрыклад, сёлета пачалі працаваць студэнцкія групы, якія вывучаюць замежныя мовы (праводзяцца курсы «Французская мова дзелавых зносін», а таксама праграма «Камунікатыўная граматыка нямецкай мовы»). Дадзены кірунак мы плануем і далей актыўна развіваць.

Акрамя таго, ФПКП прапануе адукацыйныя паслугі – праграмы дадатковай адукацыі – ВНУ і арганізацыям іншых краін. За бягучы год у нас былі рэалізаваны праграмы для Рэспублікі Казахстан і Кітайскай Народнай Рэспублікі, у тым ліку праводзіліся курсы рускай мовы, напрыклад, праграма «Руская мова як сродак міжкультурнай камунікацыі» для студэнтаў Ланьчжоўскага ўніверсітэта, якія прыехалі ў БДУ і на працягу студзеня вывучалі рускую мову.

Адначу, што мы актыўна пашыраем супрацоўніцтва з карпаратыўным сектарам. Калі раней нашым асноўным замоўцам кадраў было Міністэрства інфармацыі, то сёлета мы сумесна з эканамфакам арганізавалі праграму на замову Нацыянальнага банка. Цяпер праграцоўваем праграму з Беларускай атамнай электрастанцыяй. Нядаўна завяршылася праграма, арганізаваная на запыт бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі: правялі для ўрачоў навучальны семінар-трэнінг псіхалагічнай скіраванасці «Камунікатыўная кампетэнтнасць урача». Дарэчы, гэта быў выязны семінар – адна з формаў навучання, якую мы цяпер развіваем. У чэрвені пачынаюцца праграмы «Лацінская мова і ўводзіны ў антычную культуру» (распрацавана сумесна з філфакам для выкладчыкаў лацінскай мовы). Сумесна з гістфакам для кіраўнікоў і супрацоўнікаў устаноў культуры, прадпрыемстваў турыстычнай індустрыі, экскурсаводаў, гідаў-перакладчыкаў, суб'ектаў аграэкатурызму распрацавана праграма «Этнакультурная спадчына Беларусі і яе выкарыстанне ў турызме».

## Увага практыкам

– Як я ўжо адзначыла, пераважна нашы слухачы – дарослыя людзі, якія маюць вышэйшую адукацыю. Прыходзячы да нас вучыцца, яны мяркуюць атрымаць новыя веды, набыць канкрэтныя вузкія кампетэнцыі, неабходныя ім у працы. Гэта ўскладняе і распрацоўку праграм, і пошук выкладчыкаў, якія змогуць задаволіць запыты слухачоў. Мы не толькі прыцягваем да выкладання супрацоўнікаў БДУ, але і ўзаемадзейнічаем са спецыялістамі-практыкамі. Напрыклад, праграма «Дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь і свеце: новыя магчымасці па развіцці інфраструктуры» распрацавана сумесна з Нацыянальным агенцтвам інвестыцый і прыватызацыі пры Міністэрстве эканомікі, паколькі іх спецыялісты паглыблена займаюцца гэтай тэмай. А праграма «Франчайзінг як інструмент стварэння і развіцця бізнесу» падрыхтавана з асацыяцыяй «Белфранчайзінг». Прыцягненне спецыялістаў-практыкаў – гэта абавязковая ўмова для таго, каб праграма была цікавай і канкурэнтаздольнай на рынку паслуг дадатковай адукацыі.

> «Надалей плануем зрабіць акцэнт на бізнес-адукацыі і маркетынгу»

## Прасоўванне інавацыйнага выкладання

– Сёлета ФПКП стаў удзельнікам міжнароднага праекта ERASMUS + PRINTeL «Змены ў адукацыйным асяроддзі: укараненне інавацыйнага выкладання і навучання для паляпшэння адукацыйнай дзейнасці студэнтаў у краінах Усходняга партнёрства». У рамках гэтага праекта мы правялі ва ўніверсітэце бясплатныя семінары-трэнінгі па адукацыйных інавацыях для выкладчыкаў па наступных тэмах: актыўнае навучанне з акцэнтам на выкарыстанні ў адукацыйным працэсе ІКТ; відэатэхналогіі ў выкладанні і навучанні; мабільныя прыкладанні і геймніфікацыя ў адукацыйным працэсе; тэхналогія «Перавернуты клас»; тэхналогія гібрыднага (змяшанага) выкладання і навучання. А цяпер па інавацыях у адукацыі плануем распрацаваць праграму павышэння кваліфікацыі для выкладчыкаў і настаўнікаў.

## Галоўная задача – адказваць на запыты рынку

– Канкурэнцыя ў сферы дадатковай адукацыі дастаткова высокая, таму мы, прадумваючы і распрацоўваючы новыя кірункі, вывучаем запатрабаванні рынку, шукаем уласную нішу. Вялікая праца была праароблена па распрацоўцы новых праграм, яны канкурэнтаздольныя, і для іх далейшай папулярызацыі мы будзем узмацняць маркетынгавую дзейнасць: праз інфармацыйнае рассыланне для прадстаўнікоў карпаратыўнага сектара, сацыяльныя сеткі і іншыя рэкламныя сродкі.

Мы плануем развіваць праграмы ў галіне бізнесу і маркетынгу. Сумесна з эканамічным факультэтам будзе арганізавана праграма «Маркетынгавыя даследаванні». Таксама на ФПКП плануецца правядзенне семінара «Кіраванне продажамі. Эфектыўныя тэхналогіі продажаў», а з мэтай павышэння фінансавай пісьменнасці насельніцтва – навучальных курсаў па асновах прадпрымальніцкай дзейнасці і бізнес-планавання.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

Задача ўніверсітэта – падрыхтаваць запатрабаваных на рынку працы спецыялістаў і накіраваць іх на першае месца працы.

# Не толькі навучыць, але і працаўладкаваць

З нагоды працаўладкавання маладых спецыялістаў у БДУ прайшоў круглы стол **«Перспектывы пашырэння супрацоўніцтва ўстаноў вышэйшай адукацыі і працадаўцаў».** На ім прадстаўнікі ўніверсітэта і кампаній абмеркавалі пытанне патрэбнага ўзроўню ведаў выпускнікоў, неабходнасць практыка-арыентаванага навучання і пагаварылі пра асноўныя кампетэнцыі, неабходныя для паспяховай пабудовы кар'еры.

## Навучыць вучыцца

**Канстанцін КАЗАДАЕЎ, прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі:**



– Да 2019 года я кіраваў кафедрай інтэлектуальных сістэм, даводзілася камунікаваць з вялікай колькасцю прадстаўнікоў сектара IT. І мне ўвесь час гаварылі: "Чаму вы сваіх студэнтаў вучыце? Яны прыходзяць, і мы іх давучваем, пераVчваем". Я гатовы ініцыяваць змены ў навучальных праграмах, але трэба разумець, якія канкрэтна неабходныя.

**Віктар ШАДУРСКІ, дэкан ФМА:**



– Падтрымліваю. Відавочна, што мэты тых, хто рыхтуе спецыялістаў, і тых, хто іх прымае на працу, адрозніваюцца. Нам патрэбны кампраміс. Адзначу, што ў нас пакуль яшчэ няма такога працэсу, як «паляванне» на спецыялістаў, хоць любая кампанія будзе паспяхова працаваць, калі ў яе кваліфікаваныя кадры. У сучасным свеце ўсё вельмі хутка змяняецца, таму наша задача – даць базу, каб выпускнік змог і праз 30–40 гадоў арыентавацца ў сваёй сферы. Вядома, практыку нішто не адмяняў, але ў першую чаргу неабходна сфарміраваць светапогляд. А без давучвання на працоўным месцы ўсё адно не абысціся.

**Наталля БУРЭЦ, кіраўнік аддзела персаналу QulixSystems:**



– Як працадаўца скажу, што сапраўды ёсць разрыў паміж тым, якіх ведаў мы чакаем ад выпускнікоў і з якой базай іх атрымліваем у рэальнасці. І прычына не ў тым, што адукацыя не практыка-арыентаваная. Я перакананы, што ўсё-такі задача ВНУ – даць асновы і навучыць вучыцца. Пасля невялікага аналізу высветлілася, што праблема ў іншым: учорашні студэнт не памятае, якія веды яму давалі ў ВНУ, ці не ўмее іх прымяніць на практыцы. Напрыклад, у нас у кампаніі цяпер на выпрабавальным тэрміне выдатнік, які заканчвае ўніверсітэт з сярэднім балам 9,5, але ён непаспяхова ў працы, паколькі ён добра завучвае новую інфармацыю, але абсалютна не ўмее яе выкарыстоўваць. Чаму так адбываецца? Мы зразумелі адну рэч: калі студэнт не бачыць сэнсу ў тым, чаму яго вучаць, і не разумее, які прадмет спатрэбіцца ў будучыні, ён вучыць яго толькі для таго, каб здаць іспыт і забыць. Я лічу, што вельмі добрая практыка – запрашаць выпускнікоў вашага ж універсітэта, якія змогуць распавесці, чым канкрэтны прадмет можа быць карысны на працы.

**Марыя АРХІПАВА, прадстаўнік цэнтра кар'еры Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін:**



– У МДІМА мы практыкуем фармат бізнес-вячэр: запрашаем вузкі круг працадаўцаў у той ці іншай сферы, прадстаўнікоў кампаній (часта гэта нашы ж выпускнікі), якія дзеляцца сваім досведам і распавядаюць, чаго чакаюць ад маладога спецыяліста. Размова працадаўцаў і студэнтаў праходзіць нефармальна. Тое, што на такія сустрэчы прыходзяць нашы выпускнікі, набліжае фармат узаемадзеяння да ментарства, таму што яны дзеляцца досведам з наступным пакаленнем і, калі трэба, «вядуць» студэнтаў аж да працаўладкавання ў кампанію.

**Іван СТАНКЕВІЧ, дырэктар па аўдыце EY:**



– Я прыхільнік таго, каб выпускнікі прыходзілі на працу без досведу, але добра падрыхтаванымі. У першы год працы мы да волі інтэнсіўна давучваем маладых спецыялістаў, але гэта не адмяняе таго, што ў чалавека павінна быць моцная база. Напрыклад, цяпер у нашай кампаніі вельмі шануецца ўменне працаваць з вялікім аб'ёмам даных, аднак у многіх выпускнікоў кульгае нават базавы навык працы ў Excel.

## Практыка падчас вучобы – першыя крокі ў кар'еры

**Ганна КАРАЛЁВА, дэкан эканамфака:**



– На першым курсе мы працуем з учорашнімі абітурыентамі, у якіх гараць вочы, яны ўзмоцнена рыхтаваліся да паступлення і думаюць, што іх адразу навучаць, як зарабляць. Але, вядома, як і на любым іншым факультэце, у першую чаргу мы даём студэнтам тэорыю і ў канцы першага курса атрымліваем расчараванага студэнта, яго чаканні не апраўдаліся, і ён страчвае матывацыю. На маю думку, работу па працаўладкаванні маладых спецыялістаў трэба пачынаць ужо з першага курса, бо першакурснікі выбіраюць спецыялізацыю, яшчэ не разумеючы, кім сапраўды хочуць стаць. Многія выбіраюць банкаўскую справу, а да трэцяга курса ўжо расчароўваюцца ў сваім рашэнні, таму мы павінны даваць выбар, распавядаць студэнту пра магчымасці адукацыі, якую ён атрымлівае, тлумачыць, што калі вучышся на эканамічнай тэорыі, то не абавязкова павінен стаць выкладчыкам гэтай дысцыпліны.

На эканамічным факультэце мы актыўна ўкараняем практыка-арыентаванае навучанне. Напрыклад, сёлета з адным з банкаў склалі дамову пра сумеснае даследаванне – нашы студэнты працуюць над укараненнем банкаўскага прадукту. Яшчэ адным укараненнем стала эксперыментальная дысцыпліна, у рамках якой студэнты нашага факультэта і двух іншых сумесна арганізоўваюць і праводзяць конкурс стартап-праектаў.

**Леанід ГАЙДУКЕВІЧ, загадчык кафедры міжнароднага турызму ФМА:**



– Прафесіяналізм нашага выпускніка фарміруецца ў два этапы. Першы – адукацыйны, які дазваляе ўвесці студэнтаў у прафесійную прастору: на 1–2 курсах навучальна-азнаямленчая практыка на аб'ектах турындустрыі, двухдзённыя навучальна-адукацыйныя экскурсіі. Другі этап – вытворчая адаптацыя студэнтаў: арганізуем практыку на прадпрыемствах, пашыраем колькасць дыпломных праектаў пад замову працадаўцаў. Вялікі эфект мы атрымліваем ад працы філіяла кафедры ў БГА «Адпачынак у вёсцы», на базе якога студэнты распрацоўваюць канкрэтныя праекты па беларускіх аграэкасядзібах. Адзначу, што ў навучальны працэс мы актыўна прыцягваем кіраўнікоў туркампаній, прадстаўнікоў атэльнага бізнесу: 10 % аўдыторнай нагрузкі фактычна аддаецца спецыялістам-практыкам, якія праводзяць майстар-класы. Мы падтрымліваем працаўладкаванне студэнтаў на працягу навучальнага года і лічым нармальным, калі студэнты 3–4 курса працуюць у другой палове дня, фактычна падключаючыся да вытворчага працэсу, спазнаюць яго знутры. Да моманту выпуску ўсе нашы студэнты маюць месцы для працаўладкавання.

**Алена КОТАВА, начальнік дэпартамента па рабоце з персаналам «БСБ-банка»:**



– Нашы топ-менеджары праводзяць майстар-класы ва ўніверсітэце, сам банк удзяляе ўвагу ў днях кар'еры і выступае спонсарам студэнцкіх канферэнцый. Мы актыўна бяром хлопцаў і дзяўчат на практыку, пры гэтым разумеем, што ў студэнта 2–3 курса не можа быць поўнага набору неабходных ведаў, якія дазвалялі б разглядаць яго як паўнавартаснага супрацоўніка, але ў першую чаргу мы глядзім на зацікаўленыя вочы, наяўнасць матывацыі і гатоўнасць шмат вучыцца. На сумоўі мы звяжаем на тое, ці зрабіў чалавек нейкія самастойныя крокі, каб увайсці ў прафесію: можа, прачытаў нейкую кнігу па спецыяльнасці ці прайшоў анлайн-курс. Нам важна бачыць зацікаўленасць. Скажу, што 70 % практыкантаў пасля ВНУ ўладкоўваюцца да нас у кампанію.

**Ганна ПІСАРЭНКА, «Брытыш Амерыкан Табака»:**



– Адна з магчымасцяў, якую мы даём студэнтам, – кароткатэрміновае працаўладкаванне падчас летніх канікулаў. Гэта дазваляе пазнаёміцца з кампаніяй, зрабіць праект, прадэманстраваць нейкія вынікі. Па выніках такой практыкі мы прымаем рашэнне пра далейшае супрацоўніцтва са студэнтам, калі ён зацікаўлены.

## Самапрэзентацыя – навык нумар адзін

**Алена КОТАВА, начальнік дэпартамента па рабоце з персаналам «БСБ-банка»:**

– У нас адно з карпаратыўных патрабаванняў да маладых спецыялістаў – жаданне расці і развівацца. Калі выпускнік хоча працягнуць навучанне ў магістратуры ці пасля каледжа хоча атрымаць завочную вышэйшую адукацыю, то мы гэта толькі вітаем і нават аплачваем навучанне ў залежнасці ад паспяховасці. Калі чалавек вучыцца на сярэдні бал 8 і вышэй, то банк цалкам аплачвае навучанне. Сярод дзейных супрацоўнікаў мы ўвесь час праводзім навучальныя мерапрыемствы.

**Ганна ПІСАРЭНКА, «Брытыш Амерыкан Табака»:**

– У нашай кампаніі ёсць міжнародная праграма менеджараўстажораў, якая дазваляе маладому спецыялісту хутка пабудаваць кар'еру і вырасці да кіраўніка. У Беларусі ў нас была вялікая праблема: амаль два гады шукалі ўдзельнікаў на гэту праграму, таму што ў кандыдатаў быў нізкі ўзровень англійскай мовы, а яшчэ яны не маглі прайсці цэнтр ацэнкі менеджарскага патэнцыялу. Гэта такое практычнае заданне, калі чалавек павінен вырашыць вельмі набліжаныя да бізнесу задачы і прэзентаваць рашэнне. Падобны тэст дазваляе вызначыць, ці ёсць у кандыдата лідарскія якасці, але, на жаль, узровень праходжання цэнтра ацэнкі быў нізкім. І мы задумаліся, што са свайго боку як працадаўцы можам зрабіць, каб даць студэнтам магчымасці навучання. Цяпер мы праводзім ва ўніверсітэтах воркшопы, сёлета запускаем міжнародны кейс-чэмпіянат Battleofminds.

**Марыя АРХІПАВА, прадстаўнік цэнтра кар'еры МДІМА:**

– Вельмі многія думаюць, што ў выпускнікоў МДІМА праблем з працаўладкаваннем няма, і нашы студэнты думаюць, што яны выпусцяцца і лёгка знойдуць сабе працу. Праблема ў тым, што ў студэнтаў часта адсутнічае матывацыя. У рэальнасці тое ж МЗС на практыку бярэ да 500 чалавек у год, але працу пасля выпуску зможа прапанаваць толькі 100–150 выпускнікам. А выпуск у нас каля 2000 чалавек, каб вы разумелі маштабы. Для таго, каб дапамагчы студэнтам, мы праводзім буйныя кар'ерныя форумы, пасля іх некаторыя кампаніі пачынаюць у нас чытаць спецыяльныя курсы для студэнтаў. Таксама плануем кожны месяц праводзіць майстар-класы па напісанні рэзюмэ і распавядаць, як праходзіць сумоўе, каб малыя спецыялісты ўмелі прэзентаваць сябе.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**У БДУ адкрыты першы ў Беларусі інавацыйны цэнтр SAP Next-Gen Lab** – БелТА, news.21.by, interfax.by (22.05), delo.by (23.05), iba.by (24.05).

**Канцэпцыя працы гарадскіх інфармацыйных кропак распрацавана ў БДУ** – БелТА, Беларусь-1, СТБ, Мінск-ТБ, belnovosti.by, «Мінск-Навіны» (22.05), sb.by (23.05), zviazda.by (24.05).

**Юбілейныя XXV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні «Спадчына святых Кірыла і Мяфодзія ў сусветнай духоўнай культуры» прайшлі 30–31 мая ў БДУ** – БелТА, zviazda.by (30.05), patriarchia.ru (03.06).

**Студэнты БДУ змогуць дадаткова вывучаць дысцыпліны на выбар** – БелТА, tut.by, sputnik.by, sodrugestvo.info, zviazda.by, reform.by, belnovosti.by, tut.by (28.05), naviny.by, БелаПАН (29.05), «Звязда» (30.05), «Мінск-Навіны», Беларусь-1 (09.06).

**Ушанаванне лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў адбылося 24 мая ў БДУ** – БелТА, sb.by, СТБ (24.05), sb.by, «Знамя юности» (30.05).

**Агульны конкурс у Ліцэй БДУ склаў 6,6 чалавека на месца** – zviazda.by (29.05), sb.by, nn.by (30.05).

**Круглы стол «Метадалогія, змест, практыка крэатыўнай адукацыі ў рамках канцэпцыі „Універсітэт 3.0“» адбыўся 17 мая** – «Настаўніцкая газета» (23.05), «Звязда» (29.05).

**Летняя археалагічная школа ўпершыню адкрылася ў БДУ** – БелТА, yandex.by, freesmi.by (03.06), «Звязда» (05.06).

**У БДУ абвешчаны набор у магістратуру** – БелТА, «Мінск-Навіны», sb.by, belnovosti.by, soyuz.by (06.06), rg.ru (11.06).

**Паміж БДУ і Даляньскім політэхнічным універсітэтам (ДПУ, Кітай) падпісана дамова пра абмен навучэнцамі** – «Рэспубліка (06.06), «Мінскі кур'ер», «СБ. Беларусь сёння» (07.06).

**У БДУ будуць навучаць армейскіх піяршчыкаў** – sputnik.by, АНТ, zviazda.by (04.06).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

Універсітэт
25 чэрвеня 2019 года, № 9 (2215)

Год малой радзімы міжволі звяртае нас да каранёў. Мы маем шмат цікавых гісторый з нашага дзяцінства. Да месца, дзе нарадзіўся, адчуваеш цеплыню і любоў, дзе б ты зараз ні жыў. Мы спыталі кіраўнікоў структурных падраздзяленняў БДУ пра тое, які куток краіны стаў для іх малой радзімай, якую ролю гэта месца адыграла ў іх жыцці. Таксама мы папрасілі назваць 5 фраз ці слоў, якія ў іх асацыіруюцца з малой радзімай. Шэсць нашых герояў – прадстаўнікі кожнай вобласці краіны.

# Калыска характару

## Ала Уладзіміраўна МЕЛЕХ, дырэктар студэнцкага гарадка

– Мая малая радзіма – вёска Мажа Капыльскага раёна ***Мінскай вобласці***. Там правяла 18 гадоў, пакуль не паступіла на фізічны факультэт БДУ, пераехала вучыцца ў Мінск. З малой радзімай у мяне асацыіруюцца такія ўспаміны:

**1. Школа № 1**

У ёй вучылася з 5 класа (зараз гэта гімназія). Гэта той куток, дзе праводзіла большую частку свайго часу. У школу з'язджала а 7-й раніцы, вярталася дахаты далёка за 6 гадзін вечара. Мне падабалася не толькі вучыцца, але і займацца грамадскай працай. У нас быў дружны клас, як і паралель. Мы падтрымліваем зносіны дагэтуль, дапамагаем адзін аднаму, нягледзячы на тое, што многія раз'ехаліся па ўсёй краіне, а некаторыя – за мяжой. Тым не менш збіраемся разам у школе на круглыя даты, на вечары сустрэч.

**2. Працавітыя людзі**

Чысты, зялёны куток, багаты на добрых і працавітых людзей. На Капыльшчыне многа сваіх герояў: 10 чалавек ганараваны звання Героя СССР, 9 Герояў Сацыялістычнай Працы, больш за 40 маюць ордэн Леніна. Магчыма, гэта звязана яшчэ і з тым, што ў XVI стагоддзі Капыль славіўся рамёствамі, асабліва ткацтвам, аксамітавымі і лайкавымі вырабамі. З тых часоў засталася ў людзях працавітасць, яна перадаецца з пакалення ў пакаленне. Успамінаю, як мая бабуля для ўсёй сям'і шыла тапкі і вырабляла валёнкі. Тое ж самае магу



*Ала Мелех са старэйшай сястрой*

сказаць і пра свайго бацьку. Ён сваімі рукамі пабудаваў дом у Мажы. Гэта маё ўлюбёнае месца, дзе з задавальненнем адпачываю на выхадных. Мне там і дыхаецца па-іншаму. Усё добрае і станоўчае я звязваю менавіта з гэтым мястэчкам, роднай хатай. Мяне навучылі: хто можа добра працаваць, той можа добра адпачываць. Як гэта робяць на Капыльшчыне, можна ўбачыць 3 ліпеня на свяце горада, яно традыцыйна праходзіць прыгожа і маштабна, з масавымі гуляннямі, выступленнямі на канцэртных пляцоўках мясцовых калектываў, конкурсамі і прызамі. Падзея збірае ўсіх тых, хто там вырас.

**3. Творчы край**

На Капыльшчыне нарадзілася амаль 40 вядомых пісьменнікаў. Сярод іх Цішка Гартны, Кузьма Чорны, Анатоль Астрэйка, Адам Русак, Алесь Адамовіч, Сцяпан Александровіч і іншыя.

**4. Выбітнасці Капыльшчыны**

Гэта Спаса-Узнясенская царква, якая была пабудавана ў 1866 годзе. Гэта Замкавая гара – ледніковы астанец, апрацаваны для большай круцізны схілаў. Капыль размешчаны на ўзгорках, тут гарыстая мясцовасць. «Маленькая-маленькая Швейцарыя» – так я яе заву. Капыль славіцца сваімі старадаўнімі сядзібамі, сёння яны адраджаюцца, прымаюць турыстаў, там праводзяцца святы. Да 725-годдзя горада ўсталяваны памятны камень як добры знак, ён сустракае тых, хто вяртаецца ў Капыль.

**5. Спартыўныя мерапрыемствы**

У Капылі вось ужо 10 гадоў запар праходзіць чэмпіянат Беларусі ў марафонскай эстафеце, які збірае і замежных гасцей. Асаблівасць гэтага спаборніцтва ў ландшафце. Гэта бег па прыродным рэльефе. Трасы ў 3, 5 і 10 км пралягалі праз багністую мясцовасць, былі ўсталяваны штучныя перашкоды. Я таксама ўдзельнічала летась у бегу на 5 км. Трэба абысці, фінішаваць, перамагчы. Хоць, вядома, перамагае сяброўства.

Малая радзіма дае сілы, радуе, лечыць, падтрымлівае, натхняе на добрыя ўчынкі. Успамінаю з вялікім цяплом маіх бацькоў. Магу таксама сказаць добрыя словы пра тых людзей, якія працавалі і працуюць у школе. Мае настаўнікі. Тое, што я стала студэнткай, што я займалася грамадскай працай у БДУ, прышчэплена школай. А яшчэ малая радзіма навучыла, што трэба быць уважлівым да навакольных. «Спраўляешся сам – дапамажы словам ці справай блізкаму» – гэта фраза стала маім дэвізам.

## Пётр Іванавіч БРЫГАДЗІН, дырэктар Інстытута бізнесу БДУ:

– Мая малая радзіма – вёска Моладава Іванаўскага раёна ***Брэсцкай вобласці***. Сюды наша сям'я пераехала з хутара (ён знаходзіўся за кіламетр ад Моладава), калі мне было 6 гадоў. Тут я скончыў школу, а ў 17 гадоў стаў студэнтам гістарычнага факультэта БДУ. Дарэчы, нас у сям'і было чацвёра дзяцей, і ўсе мы ў свой час атрымалі дыплом Белдзяржуніверсітэта. На малую радзіму я прыязджаю штогод. З гэтымі месцамі мяне звязваюць такія ўспаміны:

**1. Родныя словы**

«Пеця, ідзі дахаты» – засталіся ў памяці гэтыя распеўныя словы мамы (яна спявала ў царкоўным хоры). Памятаю, калі гуляў з хлапчукамі ў канцы вуліцы і чуў гэтыя словы, то разумеў, што мяне чакаюць дома, будзе праца.

«Рыхтык» – нямецкае слова, якое любіў гаварыць бацька, яно значыць «сапраўды».

«Наперад, магчыма, на міны, але наперад» – гэта мая фраза з'явілася тады, калі даведаўся, як загінуў ва Усходняй Прусіі ў студзені 1945 года старэйшы брат бацькі Цімафей – салдатаў пагналі на міны.

**2. Занятасць**

Часу вольнага амаль не было. Школьныя справы часцяком не былі прыярытэтам, калі было вельмі шмат працы па гаспадарцы. Вольны час быў як свята. Узімку мы з сябрам гулялі ў шахматы (гэта быў наш улюбёны занятак), а ўлетку гулялі



ў футбол і хадзілі плаваць на раку. Кожны дзень, вярнуўшыся са школы, дапамагалі бацькам. На мне быў цэлы функцыянал: прынесці дроў, натапіць печку, прыбрацца ў двары, улетку ехаць па траву, пасвіць жывёл і іншае. Гэтыя пастаянныя абавязкі выхавалі ўва мне паважлівае стаўленне да працы.

**3. Кветнікі і хаты, якія не зачыняліся на замок**

Гэтыя ўспаміны пра цвіценне засталіся са мной дагэтуль. Велізарныя кветкі розных колераў. Жыхары высаджвалі іх каля хат, двары былі надзвычай маляўнічыя. Кожны імкнуўся вылучыцца. У нас таксама хата была акружана самымі прыгожымі кветкамі з трох бакоў.

**4. Прыгажосць палескай зямлі**

Гэта густы лес, малыя рэчкі, якія працякалі побач з вёскай і ўпадалі ў раку Ясельду, паплавы…

**5. Знакамітая вёска: Войны, Агінскія, Скірмунты**

Ёсць пісьмовае згадванне, што Мацвей Война атрымаў ад пінскага князя Фёдара Яраслававіча дворышча ў Моладаве ў 1497 г. Захаваўся ў мясцовай Узнясенскай царкве старадаўні звон, адліты ў Коўне ў 1583 г. у памяць пра Мацвея Войну. Па некаторых дадзеных гэта самы стары звон у Беларусі.

Пасля Войнаў маёнтак у спадчыну перайшоў вядомай сям'і Казіміра Агінскага, а затым у канцы 18 стагоддзя быў прададзены Міхалам Клеафасам Шымону Скірмунту. Новыя гаспадары ператварылі Моладава ў прамысловую сталіцу рэгіёна – менавіта тут каля 200 гадоў назад запрацаваў адзін з першых цукровых заводаў Беларусі. Аляксандр Скірмунт атрымаў першы афіцыйна зарэгістраваны ў нашай краіне патэнт на сваё вынаходства, якое дазваляла паскорыць аперацыю па выпарванні цукру з сіропу з 4 гадзін да 5 хвілін. На жаль, сядзіба Скірмунтаў не захавалася, велічны будынак падарвалі падчас вайны. Пра былую раскошу мястэчка нагадвае толькі капліца-пахавальня. Капліца ўражліва прыгожая: калоны, порцікі і ляпніна. Трэба адзначыць, Узнясенская царква і капліца Скірмунтаў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Я лічу, што малую радзіму цяжка ацаніць адной фразай. Наш унутраны свет, стаўленне да людзей, даручаны справы – усё гэта звязана з дзяцінствам, тым асяроддзем, у якім мы гадаваліся.



*Іван Янушэвіч (другі злева), 6 клас Рахавіцкай*

## Іван Іванавіч ЯНУШЭВІЧ, прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях:

– Я нарадзіўся ў вёсцы Забулле Слонімскага раёна ***Гродзенскай вобласці***. Там жыў датуль, пакуль не паступіў на гістарычны факультэт БДУ, тады пераехаў у Мінск. З малой радзімай у мяне ўзнікаюць такія асацыяцыі:

**1. Сям'я**

Самыя цёплыя ўспаміны звязаны з роднымі. Жывыя мае бацькі, якія мяне выгадавалі. Па магчымасці іх наведваю, прыязджаю на выходныя, дапамагаю ім.

Успамінаю сваё дзяцінства. У маёй жа мясцовасці недалёка ад роднай хаты жылі бабуля і дзядуля. Дзед быў спачатку калгасным садоўнікам і пчаляром, а потым ужо займаўся гэтай працай індывідуальна, у яго былі свае пчолы. Урэзалася ў памяць тое, што гэтыя насякомыя балюча кусаліся, асабліва калі раіліся, мы ад іх уцякалі. У дзеда было каля 20 вулляў, часам накатвалася бочка мёду аб'ёмам літраў 200. А бабуля пякла ў печы хлеб на кляновых, дубовых лістах, пірагі. Атрымліваліся вялікія духмяныя боханы.

**2. Школа**

У школу даводзілася дабірацца галоўным чынам пешшу ці на роварах праз лес. Спачатку вучыўся ў Хмяльніцкай пачатковай школе (гэта каля 3 км ад дома), потым у Рахавіцкай базавай (амаль 5 км), а затым у Міжэвіцкай сярэдняй (прыблізна 7 км). Хада, дарэчы, вельмі карысная для здароўя. Класы былі невялікія па колькасці дзяцей, таму настаўнікі надавалі кожнаму шмат увагі.

**Анатоль Афанасьевіч ТОЗІК, дырэктар Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ:**

– Я нарадзіўся на Палессі ў вёсцы Казанск. Тады гэта быў Даманавіцкі раён Палескай вобласці, цяпер Калінкавіцкі раён ***Гомельскай вобласці***. Звычайна малой радзімай лічаць той кавалачак зямлі, дзе чалавек нарадзіўся і зрабіў першыя крокі. Але я думаю, што могуць быць і іншыя крытэрыі малой радзімы. Па-рознаму складаецца жыццё, і не толькі першыя гады пакідаюць у памяці глыбокія сляды.

**1. Палессе**

Лічу сябе беларусам-палешуком, хоць наша сям'я пражыла там нядоўга. Бацька быў чыгуначнікам, і, калі мне ішоў чацвёрты год, сям'я пераехала ў Жлобінскі раён.

**2. Родная хата**

Жылі мы ў невялікай хатцы, складзенай у пасляваенныя гады са старых шпал, пры самай чыгунцы (да рэек было метраў 25–30). Менавіта з гэтым месцам звязаны мае першыя дзіцячыя ўспаміны.

**3. Школа**

Мне вельмі дарагія тыя месцы, дзе прайшлі мае школьныя гады, там яшчэ жывуць мае школьныя сябры, на вясковых могілках магілы маіх бацькоў. У 1966 годзе я скончыў Мормальскую сярэднюю школу, якая была ў найбліжэйшай вёсцы. Тады ж – а было мне сямнаццаць гадоў – з'ехаў у Мінск і паступіў на гістарычны факультэт БДУ.

Большую частку свайго жыцця пражыў у Мінску, за выключэннем пяці гадоў, калі ў якасці пасла нашай краіны жыў і працаваў у Пекіне.



**4. Брэстчына**

З 2000 да 2006 года, працуючы старшынёй Камітэта дзяржкантролю краіны, быў упаўнаважаным Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці і вельмі прывязаўся да Брэстчыны.

**5. Белдзяржуніверсітэт**

Усе гэтыя месцы для мяне аднолькава дарагія. Але калі б мяне папрасілі назваць штосьці адно, то я б сказаў: мая малая радзіма – гэта перш за ўсё наш універсітэт. Мая студэнцкая юнацкасць прайшла ў аўдыторыях БДУ і ў інтэрнаце на Свярдлова, дзе ўсе гады мы, шэсць аднакурснікаў, дружна пражылі ў адным пакоі. Наступныя амаль восем гадоў таксама прайшлі ва ўніверсітэце – аспірант, выкладчык, сакратар камітэта камсамола ўніверсітэта.

Я сапраўды шчаслівы, што пасля сыходу ў адстаўку з дзяржаўнай службы я магу яшчэ штосьці зрабіць для ўніверсітэта – сваёй асноўнай малой радзімы.



*...школы. Настаўніца Тамара Іванаўна Бузук*

Аднойчы, у класе другім, здаецца, вяртаўся са школы і праваліўся на возеры пад лёд. Тады на 8 сакавіка распусціліся коцікі, хацеў іх дастаць і падарыць матулі. На шчасце, выбраўся сам.

**3. Праца**

Вясковае жыццё звязана з фізічнай працай. Працуюць не толькі дарослыя, але і дзеці. Ты прачнуўся і пачаў займацца чымсьці карысным. Гэта нармальна. Часам з'ездзіў на рэчку, а потым ізноў трэба брацца за справу. Напрыклад, запомніў, як пасвіў кароў з раніцы да вечара. Але ў гэтым была і свая карысць: можна было ў вялікай колькасці чытаць кнігі. Памятаю, як дзед малаціў жыта ўручную пасля таго, як бабулі яго зжалі. У снапы ставілі, звозілі ў гумно, сушылі.

**4. Калгасны сад**

У вёсцы было шмат садоў, асабліва прыгожым быў вялікі калгасны (цяпер яго ўжо няма). Увесну ён быў асабліва маляўнічы, калі ажываў феерверкам фарбаў. З'яўлялася лісце, распускаліся бутоны на галінках дрэў.

**5. Гай**

Так у нас зваўся густы лес, недалёка было невялікае возера. Увесну ў лесе гучалі трэлі разнастайных птушак, а ўлетку на возеры па вечарах можна было пачуць «спеў» жаб. Памятаю сяброў дзяцінства, з якімі мы хадзілі па мясцовых сцежках. Гэта маладосць, той перыяд, калі ўсё было выдатна.

Лічу, малая радзіма іграе вызначальную ролю ў фарміраванні характару, станаўленні як асобы. Яна выхоўвае духоўна-маральныя якасці. Мне яна дала звычку працаваць, навучыла паважліва ставіцца да людзей, іх працы, дзяржавы.

**Віктар Генадзьевіч ШАДУРСКІ, дэкан факультэта міжнародных адносін**

– Мая малая радзіма – вёска Сар'я Верхнядзвінскага раёна ***Віцебскай вобласці.*** Я перастаў быць яе пастаянным жыхаром, калі пасля сярэдняй школы ў 1979 г. стаў студэнтам гістарычнага факультэта БДУ. Але сваю родную вёску ніколі не забываю, кожнае лета імкнуся правесці там тры тыдні адпачынку. На жаль, усё менш застаецца аднавяскоўцаў, якіх я добра памятаю і з якімі можна шчыра пагаварыць. Што асацыіруецца ў мяне з малой радзімай? Магу назваць такія словы:

**1. Дарагія родныя**

Успамінаеш бестурботнае дзяцінства, маці, у якой заўсёды можна было знайсці падтрымку ў сваіх перажываннях. Я шчаслівы, што жывы мой бацька Генадзь Сяргеевіч, які спраўна даглядае вялікі агарод. Жыве мая родная цётка Еўдакія Мікалаеўна, якая ў сакавіку 2019 г. адзначыла сваё 90-годдзе (я напісаў пра яе маладосць у кнізе, якая выйшла да стагоддзя ВЛКСМ). Яны даюць мне нехітрыя заданні па гаспадарцы, якія выконваю з вялікім задавальненнем, уяўна вяртаючыся ў дзяцінства.

**2. Крынічная вада ракі Сар'янкі**

З гадамі прыйшло ўсведамленне: малая радзіма чароўным чынам дапамагае аднавіць сілы пасля напружанага працоўнага года. Рака Сар'янка, што працякае ў цені дрэў і жывіца вадой з крыніц, свежае паветра, простая, знаёмая з дзяцінства ежа, фізічная праца... Сыходзяць



трывожныя думкі, забываюцца непатрэбныя спрэчкі.

**3. Сар'янскі касцёл, які цяпер належыць праваслаўнай абшчыне**

Сар'і пашанцавала з гісторыяй і сучаснасцю. Заснаваная ў 1506 годзе ў якасці маёнтка дзяржаўным дзеячам Вялікага Княства Літоўскага Іванам Сапегам, яна пераходзіла ад аднаго ўласніка да іншага. Найбольш вядомым яе ўладальнікам у XIX стагоддзі быў Ігнат Лапацінскі. Ён пачаў будаўніцтва ў Сар'і каменнага храма ў неагатычным стылі (архітэктар Густаў Шахт), які асвяцілі прыкладна ў 1857 годзе. Яго першапачатковае аблічча можна ўявіць па малюнку выбітнага асветніка Напалеона Орды. У савецкі перыяд храм з чырвонай цэглы выкарыстоўвалі як складское памяшканне. Энергічны дырэктар мясцовага саўгаса Уладзімір Скробаў прыклаў нямала высілкаў для рамонту архітэктурнага помніка і фактычна выратаваў яго ад разбурэння. У 1990 г. храм перадалі праваслаўнаму прыходу Прачыстай Найсвяцейшай Багародзіцы. У 2011 г. тут усталявалі помнік нябесным заступнікам шлюбу святым Пятру і Фяўроні.

**4. Гай**

Ад маёнтка памешчыкаў Лапацінскіх да сёння захаваліся парк («гай») з ажурнымі каванымі варотамі на ўваходзе, рэдкімі для Беларусі пародамі дрэў і некалькі будынкаў для прыслугі. Люблю там гуляць, а калі быў маладзейшы, то штораніцы бегаў у парку.

**5. Партызанскі край, трагічныя старонкі гісторыі ў гады Другой сусветнай вайны**

У гады Вялікай Айчыннай Сар'я, як і дзясяткі вёсак у наваколлі, была знішчана фашысцкімі карнікамі. Попел з 14 вёсак, спаленых разам з жыхарамі, пахаваны на сімвалічных могілках у Хатыні. Сар'і пашанцавала больш: вёску цалкам аднавілі. Сёння ў ёй некалькі сотняў жыхароў, 10 гадоў назад яна атрымала статус аграгарадка. Пра ваенную трагедыю нагадваюць два помнікі ў цэнтры парку. Шматвяковая гісторыя Сар'і мае патрэбу ў больш актыўным даследаванні. Гэта тычыцца не толькі яе сярэднявечных старонак, ваеннага часу, але і пазнейшых падзей. Жывыя яшчэ сведкі, якія могуць расказаць, як аднаўлялі на папялішчы вёску, як рупліва працавалі, як вучылі дзяцей паважаць сваю зямлю, пераадольваць перашкоды.

Удзячны бацькам, настаўнікам, аднавяскоўцам. Менавіта ў зносінах з імі я вызначыў для сябе, «што такое добра і што такое дрэнна».

**Таццяна Васільеўна ГАЕЎСКАЯ, дырэктар НДІ ФХП**

– Я нарадзілася ў Магілёве ў сям'і дзяржслужачага, праз год сям'я пераехала ў Брэст. Аднак лічу сваёй малой радзімай адзін куток на ***Магілёўшчыне***, дзе нарадзілася мая мама. Гэта вёска Забалоцце ў Чавускім раёне. Там праводзіла свае летнія канікулы да паступлення ва ўніверсітэт. З гэтым месцам у мяне асацыіруюцца такія словы:

**1. Цётачкі**

Бацька нарадзіўся ў вёсцы Пустынкі Мсціслаўскага раёна. З боку бацькі ў маіх бабулі і дзядулі было 8 дзяцей, з іх двое мужчын. У астатніх жанчын мужы загінулі на вайне. Таму дзядулю і бабулі хапала клопатаў, каб даглядаць унукаў. Так маё лета праходзіла пад наглядам мамчыных сясцёр.

Дзве сястры мамы жылі ў вёсках Забалоцце і Украіна. Паміж гэтымі кропкамі была адлегласць у 4 кіламетры, якія я праязджала на веласіпедзе. Мае цётачкі лічылі, што мяне трэба было прывучаць да працы. Мяне навучылі жаць жыта, складаць снапы, касіць траву. І цяпер магу гэта рабіць, можа, не вельмі якасна.

Заўсёды паважала сваіх цётачак, яны жылі ў нялёгкіх умовах у цяжкі час. Грошай не было, яны трымалі гаспадарку, хоць гэта цяжкая фізічная праца. На жаль,



вайна забрала іх мужоў. Разлічваць яны маглі толькі на сябе.

**2. Грэцкія палі**

Яны былі велізарнымі, хараша квітнелі ўлетку. Памятаю, як еду на веласіпедзе і адчуваю гэты пах.

**3. Яблыневы сад**

Там я звычайна чытала кнігі, якія брала ў мясцовым клубе.

**4. Лес**

Хадзілі ў грыбы, ягады. Збіралі мяшкамі арэхі і ўзімку іх лузалі. Гэта была вялікая падмога ў гаспадарцы.

**5. Простая ежа**

Малако, смятана, тварог, квас з бярозавіку, цыбуля, сала. Мае сваякі – доўгажыхары, пэўна, у некаторай ступені дзякуючы такому харчаванню.

Сёння вёскі Украіна няма, побач ідзе нафтаправод «Дружба». Вёскі Пустынкі таксама не існуе, там зараз аднаўляюць Успенскі сабор, памятаю, як у дзяцінстве лазіла па гэтых развалінах. Забалоцце цяпер лічыцца вялікім пасёлкам. На жаль, родных там у мяне не засталося.

Я ганаруся сваёй сям'ёй. Ганаруся сваімі братамі, якія шмат чаго дасягнулі ў жыцці таксама дзякуючы сваёй працавітасці. Ганаруся бацькамі. Яны абодва ў свой час скончылі педтэхнікум у Мсціславе, бацька потым педінстытут у Магілёве. Мама выкладала беларускую мову і літаратуру. Бацька – гісторык. Ён прайшоў дзве вайны: фінскую і Вялікую Айчынную. Да вайны быў настаўнікам, дырэктарам школы, пасля фінскай скончыў ваенную акадэмію. Узнагароджаны практычна ўсімі ордэнамі СССР за баявыя і працоўныя заслугі, у тым ліку ордэнам Леніна.

Малая радзіма далучыла мяне да працы. Чалавек, які жыве ў горадзе, не разумее, што такое працаваць на зямлі. Гэта разуменне мне прышчапілі цёткі, якія займаліся маім працоўным выхаваннем. Думаю, яны сыгралі вялікую ролю ў маім далейшым станаўленні як асобы.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

**Фота з асабістага архіва герояў матэрыялу**

УНІВЕРСІТЭТ
25 чэрвеня 2019 года, № 9 (2215)

# Як змяняецца адукацыйнае асяроддзе ва ўніверсітэце

**Час патрабуе ад сістэмы адукацыі змен. Лічбавыя тэхналогіі дапамагаюць наладзіць інтэрактыўную і актыўную працу выкладчыка і студэнта, а эўрыстычныя метады дапамагаюць вучням раскрыцца. Пра сучасныя інструменты ў навучанні распавяла загадчыца кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі Святлана ХАРЫТОНАВА.**



## Развіваць творчыя здольнасці

Пра эўрыстычнае навучанне Святлана Вячаславаўна ўпершыню даведалася на вочна-дыстанцыйным аргдзейнасным курсе «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава», аўтарам якога быў рэктар БДУ Андрэй Кароль. Ва ўніверсітэце ў лютым-сакавіку мінулага года педагогі і выкладчыкі розных устаноў адукацыі атрымалі веды па крэатыўных методыках. Адначасовае павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў усіх ступеняў упершыню ў сістэме адукацыі праходзіла ў міжсеткавым рэжыме. Як адзначаў рэктар БДУ, правядзенне семінара было накіравана на развіццё эўрыстычных якасцяў выкладчыка, здольнага дзейнічаць у сітуацыі нявызначанасці, дзе няма гатовых рашэнняў.

– Гэты курс мяне вельмі здзівіў. Усё, што я даведалася пра эўрыстычнае навучанне, стала для мяне адкрыццём, – дзеліцца Святлана Вячаславаўна. – Як ствараць эўрыстычныя заданні, як планаваць і праводзіць заняткі. Зараз я працую па дадзеных методыках, укараняючы іх ва ўласную педагагічную практыку і далучаючы сваіх калегаў. Выкладчыкі нашай кафедры прымяняюць эўрыстычныя тэхналогіі ў навучанні студэнтаў па дысцыплінах «Дзіцячая журналістыка», «Фірмовы стыль часопіса», «Медыйная партрэтыстыка», «Асновы творчага майстэрства», «Эвалюцыя публіцыстыкі» і інш. Аказалася вельмі цікавым мне як выкладчыку распрацоўваць унікальныя заданні. І студэнты захоплена іх выконваюць, яны цалкам уключаны ў творчы працэс стварэння свайго, новага адукацыйнага прадукту. Навучэнцам падабаецца ацэньваць уласныя працы, параўноўваць іх з праектамі аднагрупнікаў, а затым рэфлексаваць над тым, што атрымалася, а што не.

## Вопыт правядзення адкрытага эўрыстычнага занятку

Як тлумачыць загадчыца кафедры, эўрыстычнае заданне «адкрытае» для любога вучня, яно не мае адназначных «правільных» адказаў. А ўнікальны вынік адлюстроўвае ступень творчага самавыяўлення вучня. Эўрыстычны падыход таксама паказвае шматстайнасць рашэнняў большасці прафесійных задач. Пры ацэнцы такіх заданняў улічваецца арыгінальнасць створанага адукацыйнага прадукту, даследаванне феномену з розных бакоў, інтэграванне ведаў з розных галін, значнасць для развіцця асобы.

Святлана Вячаславаўна дзеліцца сваім вопытам правядзення падобных заняткаў. Яе новая праграма па дысцыпліне «Дзіцячая журналістыка» складаецца з цэлага пераліку эўрыстычных заданняў, якія распрацаваны для вывучэння канкрэтнай тэмы курса. Напрыклад, студэнтам прапанавалася сфармуляваць уласныя рэкамендацыі па паляпшэнні кантэнту сайта і прынт-версіі трох любых перыядычных выданняў для дзяцей, а таксама абгрунтаваць эфектыўнасць свайго дызайн-праекта дзіцячага медыярэсурсу. Яшчэ на адукацыйнай платформе Moodle у іх з'явілася магчымасць прымерыць на сябе ролю законатворцы, і можа ўдасканаліць сістэму сучасных медыя для дзяцей.

Ці яшчэ вось: студэнты параўноўвалі беларускі часопіс для дзяцей, які яны любілі чытаць у дзяцінстве, з сучасным выданнем адпаведнага тыпу і мэтавага прызначэння па прапанаваных крытэрыях, а таксама ацэньвалі кожнае з іх. Затым вынікі зачытваліся перад групай, якая разважала, ці спадабаюцца часопісы, якія атрымалі максімальны бал, іх малодшым сёстрам (братам).

Акрамя гэтага студэнты прыдумлялі адказы на загадкі з сучаснай дзіцячай прэсы, якія не супадалі б з наяўнымі адгадкамі. Затым уся група большасцю галасоў выбірала найлепшыя адгадкі зыходзячы з крытэрыяў іх крэатыўнасці, лагічнай несупярэчлівасці і даступнасці разуменню чытача.

– Заняткі дынамічныя і займальныя. Было вельмі цікава назіраць, як студэнты рэагуюць на прапанаваныя заданні, што іх «чапляе» і захапляе. У канцы занятку мы праводзілі рэфлексію. Я задавала пытанні пра тое, ці спадабалася ім у такой форме працы і чаму. Студэнты выявілі зацікаўленасць, і гэта вельмі парадавала. Паглядзім, як праграма пакажа сябе ў наступным годзе, – падводзіць вынік выкладчык.

## Праект PRINTeL

Гаворка ідзе пра міжнародны праект Erasmus+ «Змены ў адукацыйным асяроддзі: укараненне інавацыйнага выкладання і навучання для паляпшэння адукацыйнай дзейнасці студэнтаў у краінах Усходняга партнёрства». Яго каардынатар – Ерэванскі дзяржаўны ўніверсітэт (Арменія).

Міжнародны праект даў штуршок стварэнню цэнтра развіцця выкладчыцкага персаналу БДУ. Для рэалізацыі праграмы праекта PRINTeL члены-эксперты цэнтра, якія прайшлі навучанне ў вядучых універсітэтах Еўропы, у лютым–красавіку цяперашняга года правялі 15 трэнінгаў для выкладчыкаў БДУ. Былі прадстаўлены найлепшыя практыкі замежных ВНУ ў галіне апрабацыі і прымянення інавацыйных метадаў і тэхналогій у выкладанні. Тэматыка была наступная: відэатэхналогіі, змяшанае навучанне, актыўнае навучанне ў фармаце «Перавернуты клас», мабільныя прыкладанні і гейміфікацыя ў адукацыйным працэсе і іншае.

Адным з членаў-экспертаў цэнтра стала і Святлана Харытонава. У рамках гэтага праекта Erasmus+ у снежні мінулага года яна разам з метадыстам навучальна-метадычнай лабараторыі інавацый у адукацыі БДУ Аленай Карпіевіч удзельнічала ў курсе па актыўным навучанні ў фармаце «Перавернуты клас» у Лінчэпінгскім універсітэце (Швецыя). З гэтай адукацыйнай тэхналогіяй эксперты цэнтра знаёмілі ўдзельнікаў семінара-трэнінгу ўвесну. Наступны этап – укараненне інавацыйных методык у навучальны курс на факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДУ на пастаяннай аснове.

Выкладчыкі кафедры, якой загадвае Святлана Харытонава, таксама наведалі яе курс увесну і ўжо выкарыстоўваюць новыя формы навучання, вядома, з улікам спецыфікі сваіх дысцыплін.

– У навучальныя праграмы кафедры ўносіцца шмат змен, якія тычацца выкарыстання інавацыйных методык, – гаворыць Святлана Вячаславаўна. – Наша кафедра рыхтуе спецыялістаў, з аднаго боку, вузкіх кірункаў: перыядычнага друку і вэб-журналістыкі. З іншага – мы даўно гаворым пра канвергентную рэдакцыю, і якраз такая ж у нас атрымліваецца «канвергентная» кафедра. Тут гарманічна злучаюцца на адзінай медыяадукацыйнай платформе традыцыйныя і лічбавыя тэхналогіі навучання.

## «Перавернутае» навучанне

Мы гаворым пра адну з эфектыўных адукацыйных тэхналогій. Тут задачы і змест хатняй і аўдыторнай працы мяняюцца месцамі («пераварочваюцца»). Гэта значыць, што навучальны матэрыял, які традыцыйна быў лекцыйным, перасоўваецца ў лічбавае асяроддзе. Тэхналогія прадугледжвае тое, што студэнт самастойна рыхтуецца да заняткаў па відэалекцыях, аўдыяпрэзентацыях, мультымедыйных файлах з арыгінальнымі і навучальнымі тэкстамі і іншых матэрыялах, адабраных выкладчыкам. Вітаюцца любыя інструменты, якія часта размяшчаюцца на адукацыйным партале БДУ (dl.bsu.by).

– Студэнтам, якія рыхтаваліся да заняткаў самастойна, у аўдыторыі прапануюцца актыўныя формы навучання – дыскусія, дэбаты, эўрыстычнае заданне, праца ў групах, прэзентацыі індывідуальных праектаў і іншае, – гаворыць Святлана Вячаславаўна. – Той матэрыял, які яны вывучылі дома перад заняткамі, мы прапрацоўваем ва ўзаемадзеянні. Да прыкладу, па методыцы «Перавернуты клас» я выкарыстоўвала на сваіх занятках інтэрактыўны анлайн-апытальнік, каб праверыць, як студэнты падрыхтаваліся да заняткаў. Студэнты на мабільных прыладах бачылі адказы свае і аднагрупнікаў, ведалі, хто адказвае першым, правільна ці не. Затым мы абмяркоўвалі вынікі. Без гэтай лічбавай тэхналогіі такой інтэрактыўнай працы з прымяненнем сучасных дэвайсаў у нас бы не атрымалася.

Адзначаецца, што падобная форма павышае прадуктыўнасць самастойнай працы, фарміруе ў маладых людзях адказнасць за вучобу. Вынікі паказваюць, што ўкараненне тэхналогіі «перавернутага» навучання стане сур'ёзным крокам у лічбавай трансфармацыі сучаснага ўніверсітэта. Такім чынам, будуць з'яўляцца новыя адукацыйныя і педагагічныя інструменты. Па словах Святланы Вячаславаўны, трэба прапанаваць адпаведныя перадавыя рашэнні ў навучанні маладога і мабільнага пакалення Z, улічваць сучасныя методыкі і працаваць з імі. І будучыня ў гэтай тэхналогіі ёсць, выкладчыкі БДУ ўжо ўкараняюць яе на сваіх курсах.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**
**Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА**

## Кампетэнтна

**Аляксандр РЫТАЎ, намеснік начальніка ўпраўлення міжнародных сувязяў, начальнік аддзела міжнародных праграм і праектаў, каардынатар праекта PRINTeL у БДУ:**



– Цэнтр развіцця выкладчыцкага персаналу быў створаны ў рамках міжнароднага праекта Erasmus+ «Змены ў адукацыйным асяроддзі: ўкараненне інавацыйнага выкладання і навучання для паляпшэння адукацыйнай дзейнасці студэнтаў у краінах Усходняга партнёрства».

Цэнтр фарміруе ў БДУ асяроддзе, якое стымулюе павышэнне крэатыўнасці зместу адукацыі, развіццё інавацыйных адукацыйных падыходаў, паўсюднае ўкараненне метадаў актыўнага навучання, а таксама шырокае выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій, уключаючы дыстанцыйнае навучанне, адкрытыя адукацыйныя рэсурсы і мультымедыйны кантэнт.

Для рэалізацыі праграм дадатковай адукацыі дарослых у галіне прымянення інавацый і інфармацыйных тэхналогій у выкладанні і навучанні ў працы цэнтра задзейнічаны эксперты з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ. Гэта тыя выкладчыкі, якія прайшлі навучанне на базе еўрапейскіх ВНУ – удзельніц праекта па пытаннях выкарыстання інавацыйных адукацыйных тэхналогій у навучанні і выкладанні. Акрамя гэтага цэнтр каардынуе распрацоўку ўнутрыўніверсітэцкіх навучальных курсаў і праграм павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу, забяспечвае рэалізацыю дадзеных праграм на базе факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДУ.

Непасрэднае кіраўніцтва і каардынацыю дзейнасці цэнтра ажыццяўляе ФПКП. У працы таксама бяруць удзел Галоўнае ўпраўленне адукацыйнай дзейнасці, навучальна-метадычная лабараторыя інавацый у адукацыі, упраўленне па рабоце з персаналам, упраўленне міжнародных сувязяў і іншыя.

Кафедра тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю факультэта журналістыкі, створаная ў 1999 г., стала прызнанай пляцоўкай па падрыхтоўцы прафесійных камунікатараў у Беларусі. Пра кірункі развіцця кафедры распавяла яе загадчыца дацэнт **Ірына СІДОРСКАЯ.**

# «Мы плануем стаць цэнтрам экспертызы і кансалтынгу»



*Калектыў штатных супрацоўнікаў кафедры. Ірына Сідорская чацвёртая злева*

***– Якія галоўныя здабыткі кафедры за 20 гадоў дзейнасці?***

– Можна ганарыцца тым, што кафедра актыўна развіваецца. Спецыяльнасць «Інфармацыя і камунікацыя» (кароткая неафармальная назва – інфакам) адносна новая, і ў моманты яе станаўлення была рызыка, што яна можа не прыжыцца на нашым рынку. Значна працей у гэтым плане тым спецыяльнасцям, у якіх ёсць трывалыя традыцыі, бэкграўнд. Нам жа давялося прыкладаць мноства намаганняў, каб спецыяльнасць засталася існаваць. На этапе зараджэння кафедры не было такога, што нам нехта задаваў вектар развіцця, мы яго шукалі самі. Ганаруся, што мы перайшлі ад журналісцкай мадэлі PR-адукацыі да камунікацыйнай, міждысцыплінарнай мадэлі, якую сфармулявалі яшчэ напачатку 20 стагоддзя бацькі-заснавальнікі піяру ў Амерыцы. Мы маглі б пайсці па мадэлі разумення PR як прэс-службы, і гэта таксама было б жыццяздольна. Але выдатна, што мы пашырылі навучальныя дысцыпліны на ўвесь спектр PR-задач – унутраны PR, медыярылэйшнз, маркетынг, сувязі з дзяржаўнымі органамі і гэтак далей. Ганаруся тым, што ў нас вучацца матываваныя студэнты, якія потым вырастаюць у прафесіяналаў сваёй справы. Працу нашых выпускнікоў ніколі не характарызавалі негатыўна. Гэта таксама нагода для гонару.

***– Прахадныя балы пры паступленні на спецыяльнасць «Інфармацыя і камунікацыя» сталі аднымі з самых высокіх у БДУ. У чым сакрэт папулярнасці інфакама?***

– Мне здаецца, што спецыяльнасць «Інфармацыя і камунікацыя» прывабная для абітурыентаў, таму што яна новая, перспектыўная, абітурыенты гэта адчуваюць, бачаць трэнды. Абітурыенты і іх бацькі разумеюць, што такія спецыялісты будуць запатрабаваны на рынку не толькі сёння, але і заўтра. Дарэчы, штогод у нас практычна 100 % студэнтаў размяркоўваюцца ў тыя месцы, куды яны хочуць і дзе іх чакаюць. Плюс да ўсяго спецыяльнасць разнапланавая і міждысцыплінарная – падыдзе і экстравертам, і інтравертам, тым, хто жадае быць «на вачах», і тым, хто хоча заставацца «ў цені». Запатрабаваны ў прафесіі і арганізатары імпрэз, і аналітыкі, і даследчыкі, і кіраванцы, і выканаўцы. Я назіраю на працягу 20 гадоў, што дзеці з рознымі схільнасцямі і патрэбамі могуць сябе рэалізаваць у прафесіі камунікатара. То бок, каб дамагчыся поспеху на інфакаме, неабавязкова быць нейкім пэўным «тыпам», у нас можна быць рознымі.

***– Сёння ў трэндзе пераход на дыстанцыйныя фарматы навучання, развіваецца анлайн-адукацыя. Як гэта ўвасабляецца на кафедры?***

– Імкнёмся скарыстаць такія фарматы на другой ступені навучання, у тым ліку таму, што ідзём насустрач магістрантам, якія працуюць поўны дзень і хочуць сумяшчаць навучанне з працоўнай дзейнасцю. Дыстанцыйныя фарматы ў нас дастасоўныя і для невялікіх груп студэнтаў дзённага аддзялення, што робіць зручным і разнастайным адукацыйны працэс. Але больш выкладчыкі нашай кафедры шануюць персанальную камунікацыю, твар у твар, гэта важна для PR. Спецыфіка прафесіі камунікатара ў тым, што трэба ўмець узаемадзейнічаць наўпрост, не толькі з дапамогай гаджэтаў і анлайн-тэхналогій.

***– У Вашым калектыве працуюць людзі розных пакаленняў і поглядаў, як яны знаходзяць агульную мову?***

– Наша кафедра вельмі цікавая. Ганаруся, што дагэтуль працуюць тыя, хто стаяў ля вытокаў яе стварэння: старшы выкладчык Ірына Пятроўна Шыбут і дацэнт Анатоль Іванавіч Салаўёў. Свежыя ідэі прыўносяць маладыя супрацоўнікі. У нас працуюць людзі з рознай адукацыяй: матэматычнай, філалагічнай, сацыялагічнай, філасофскай, журналісцкай. Гэта дае кафедры перавагі ў выглядзе living рознабаковага падыходу пры рашэнні задач. Хоць бывае складана знайсці агульную мову людзям з рознымі поглядамі, але гэта пашырае далягляд і дыяпазон думак. Галоўнае, што людзі, якія працуюць на кафедры, гарманічна дапаўняюць адзін аднаго, збалансавана і суладжана ўзаемадзейнічаюць у розных праектах, кірунках працы. У нас вельмі моцная ўнутраная культура, традыцыі, у гэтым плане мы хутчэй каманда аднадумцаў, а не проста выпадковыя калегі. Асабіста для мяне мая кафедра – вялікі матыватар у працы, яна мне напамінае дрэва – жывая, моцная структура, якая глыбока пусціла карані, якая дае карысць, бароніць ад дажджу і спякоты ўсіх вакол.

***– Якой Вы бачыце кафедру ў найбліжэйшыя 5 гадоў?***

– Кафедра цяпер выйшла на ўзровень устойлівага развіцця. Ніякія турбулентнасці не могуць перашкодзіць ёй далей развівацца. Мы заўсёды надавалі вялікую ўвагу праектнай працы, яе сапраўды шмат у нас на ўзроўні рэалізацыі студэнтамі. Цяпер у планах нарасціць экспертызу для таго, каб і выкладчыкі выконвалі праектныя працы – даследчыя, кансалтынгавыя. Хочам пабудаваць такія сувязі з прафесійнай супольнасцю і рынкам PR-паслуг, каб нас разглядалі не толькі як асноўную пляцоўку па падрыхтоўцы спецыялістаў, але і як эксперта, і як кансультанта. Таксама ў планах рэалізоўваць экспарт адукацыйных паслуг, мы адкрыты для прыёму замежных студэнтаў на другую ступень і ў аспірантуру. Тым больш што паспяховыя прыклады ў нас ёсць – у 2015 г. на кафедры абаранілася Юй Хунянь, аспірантка з Кітая, прытым з вельмі цікавай тэмай: «Фарміраванне іміджу Кітая ў сістэме масавай камунікацыі Беларусі». У перспектыве бачым развіццё кафедры па мадэлі «даследчага ўніверсітэта», дзе ў магістратуры вучыцца больш студэнтаў, чым на першай ступені. Запланавалі і далей развіваць праграмы магістратуры – пакуль у нас першая праграма «Карпаратыўная стратэгічная камунікацыя», плануем адкрыць «Геабрэндзінг», «Камунікацыі ў навуцы», у тым ліку для замежнікаў.

***– Якімі, на Вашу думку, выкладчыкамі і якасцямі павінен валодаць сучасны выкладчык?***

– Выкладчык павінен цікавіцца масавай культурай, умець прымяняць гаджэты і сэрвісы, якімі карыстаюцца студэнты. Але пры гэтым ён павінен быць лепшым «узорам» сучаснасці, да якога студэнты павінны імкнуцца. Гэта тычыцца і метадаў працы, падачы матэрыялу. Выкладчык павінен паказваць сваім прыкладам, што стаў прафесіяналам, што задаволены сваёй працай, што жыве паўнавартасным жыццём, падарожнічае, цікавіцца культурнай сферай. Хтосьці думае, маўляў, выкладчыцкая праца лёгкая, але я не згодная, бо трэба ўвесь час развівацца, быць у трэндзе.

***– Як ацэньвае працу кафедры прафесійная супольнасць?***

– Я думаю, што для супольнасці камунікатараў Беларусі наша кафедра – адназначны лідар у PR-адукацыі. Мы злучаны з рынкам вельмі трывалай сувяззю: запрашаем экспертаў галіны выкладаць, праводзіць майстар-класы, прыцягваем кампаніі і брэнды як эмпірычную базу для навуковых прац, як месца практыкі. Нас саміх увесь час запрашаюць на канферэнцыі, у журы конкурсаў. На нашым прыкладзе ярка бачная ўзаемасувязь патрэб рынку і адукацыйнага працэсу. Слухаючы прафесіяналаў на імпрэзах і канферэнцыях, я адзначаю, што дысанансу ў тым, што кажуць яны і што мы выкладаем на лекцыях, няма. Акадэмічная платформа і прафесійная супольнасць адзіныя ў сваіх мэтах, і мне радасна, што мы ідзём у адным кірунку. Больш за тое, у апошнія гады мы сталі больш рабіць супольных праектаў з дзяржаўнымі органамі, прыкладам, з Міністэрствам інфармацыі Беларусі. Важна, што сёння на дзяржаўным узроўні высока ацэньваюць важнасць прафесіі PR-спецыяліста.

**Гутарыла**
**Ганна НАВУМЕНКА**

## КАРОТКАЯ ГІСТОРЫЯ КАФЕДРЫ ТЭХНАЛОГІЙ КАМУНІКАЦЫІ І СУВЯЗЯЎ З ГРАМАДСКАСЦЮ

info com

**1994**
Пачатак дзейнасці па адкрыцці спецыяльнасці і ўдзел ПВС у міжнароднай праграме TEMPUS

**1996**
Факультэт журналістыкі ўпершыню прыняў 30 студэнтаў спецыяльнасці «інфармацыя і камунікацыя»

**26 КРАСАВІКА 1999**
Адкрыццё кафедры тэхналогій камунікацыі. Першы загадчык - Віталь Рамуальдавіч Вашкевіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**2007**
Быў запушчаны адукацыйны, асветніцкі і матывацыйны праект «Школа PR»

**САКАВІК 2008**
Правядзенне I Міжнароднага адкрытага студэнцкага форуму «ПаPRаць-кветка» (далей «PR-кветка»)

**2010**
Загадчыцай кафедры стала кандыдат філасофскіх навук дацэнт Ірына Уладзіміраўна Сідорская

**1 ЛІСТАПАДА 2013**
Пасада «спецыяліст па сувязям з грамадскасцю» занесена ў Адзіны кваліфікацыйны даведнік пасад службоўцаў Беларусі

**2014**
Кафедрай упершыню арганізаваны форум «Тыдзень беларускага PR»

**2018**
Адкрыццё праграмы магістратуры «Карпарацыйныя стратэгічныя камунікацыі»

**СТУДЗЕНЬ 2019**
Пераназванне ў кафедру тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю

## Водгукі выпускнікоў



**Павел КІСЛЫ, тэлевядучы, тэнісны каментатар, YouTube-крэатар**

– Інфакам падарыў мне неверагодных людзей, з якімі я вучыўся 4,5 года. Найкруцейшы выкладчыцкі склад: кожны педагог дзяліўся не толькі ведамі прадмета, але і сваім асабістым досведам. Вядома, я напрацаваў шмат сувязяў абсалютна ў розных прафесійных сферах.
І, самае галоўнае, інфакам вывеў амаль кожнага студэнта на рынак PR, рэкламы і медыя. Вось за гэта ўсё я люблю інфакам і кайфую, калі адказваю на пытанне: «На якой спецыяльнасці ты вучыўся?»



**Вольга ГЕРАСЕНКА, начальнік аддзела рэкламы і камунікацый авіякампаніі «Белавія»**

– Спецыяльнасць «Інфармацыя і камунікацыя» дала нам магчымасць увесь час быць у прафесійнай супольнасці, мець зносіны з экспертамі і знаходзіць варыянты для развіцця ў сферы PR. А тэарэтычная база дае ўяўленне пра ідэальны вобраз свету, і, хоць жыццё дыктуе іншыя законы, да слушнага выканання задач у PR усё адно трэба імкнуцца. За гэта імкненне да ідэалу я і ўдзячная кафедры.

УНІВЕРСІТЭТ
25 чэрвеня 2019 года, № 9 (2215)



*Ніка Нікановіч*










# Здароўе, сям'я і каханне

## Што важна для цяперашніх студэнтаў БДУ?

**Як студэнты БДУ ставяцца да сямейных каштоўнасцяў і па якім узоры будуць будаваць сваю сям'ю? Свежае сацыялагічнае даследаванне рэпрадуктыўных установак і сямейных каштоўнасцяў ахоплівае 14 факультэтаў БДУ. На замову ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю яго правяла група трэцякурснікаў ФФСН, каб выявіць найбольш значныя базавыя каштоўнасці студэнтаў.**

Апытанне паказала стаўленне маладых людзей да шлюбу, сям'і, бацькоўства і такіх феноменаў, як ЭКА, фемінізм, чайлдфры. Даследаванне праводзіцца ў чацвёрты раз з 2015 года, і вынікі ў некаторых пытаннях зусім нечаканыя.

Нінэль Ціханава, Лізавета Ляўчук, Канстанцін Багдановіч, Марыя Гардзеева, Вікторыя Крэнь, Марыя Прус, Анастасія Стахоўская, Кірыл Сырамалотаў і Марыя Кіркевіч – гэтыя студэнты-сацыёлагі правялі даследаванне і зрабілі справаздачу на сотні старонак. Пад кіраўніцтвам дацэнта і кандыдата філасофскіх навук **Ларысы Філінскай** будучыя сацыёлагі апыталі 440 чалавек. З іх 154 (35 %) юнакі і 286 (65 %) дзяўчаты. Апытанне праводзілася сярод трэцякурснікаў дзевяці факультэтаў БДУ: ФФСН, ФПМІ, ММФ, фізічнага, геаграфіі і геаінфарматыкі, біялагічнага, філалагічнага, хімічнага і журналістыкі.

### Здароўе на першым месцы

У топ-3 каштоўнасцяў навучэнцаў універсітэта ўваходзяць здароўе (66,5 %), сям'я (59,5 %) і каханне (45,3 %). Аўтарытэт для іх тыя, з кім яны больш за ўсё праводзяць часу, – сябры, бацькі. 77 % апытаных хочуць пабудаваць сям'ю па прыкладзе апошніх.

Самыя цёплыя адносіны з бацькамі ў студэнтаў з абласнога цэнтра: яны адзначаюць у іх любоў (83,3 %), сяброўства (43,9 %) і ўзаемападтрымку (66,7 %). Паказчыкі канфліктаў (20,5 %) і кантролю (24,7 %) максімальныя ў мінчукоў. Меркаванне бацькоў важнае для моладзі, да яго прыслухоўваюцца 82,2 %. Самыя папулярныя сямейныя традыцыі – святкаванне дня нараджэння (88,8 %), грамадзянскіх святаў (77,3 %), сумесныя абеды і вячэры (55,6 %).

Станоўчае стаўленне да традыцыйнай сям'і дамінуе сярод студэнтаў БДУ, аднак юнакі часцей паказваюць яе як значную і неабходную форму адносін паміж мужам і жонкай (60,4 % і 51,2 % дзяўчат адпаведна). Ларыса Уладзіміраўна тлумачыць гэта тым, што ў часткі апытаных дзяўчат традыцыйная сям'я выклікае негатыўную асацыяцыю з патрыярхатам.

Тры чвэрці (72,9 %) студэнтаў падтрымліваюць афіцыйную рэгістрацыю шлюбу. Юнакі да гэтага імкнуцца радзей, станоўча ставяцца да сужыцця (81,2 %), сярод дзяўчат гэта 61,4 %. Аднак больш за палову дзяўчат 58 % не ўхваляюць яго, лічаць прыкметай несур'ёзных адносін.

Большасць дзяўчат і юнакоў (65,9 %) хочуць мець двух дзяцей ва ўзросце 23–27 гадоў (59 % дзяўчат, 38,7 % юнакоў) праз 3–4 гады шлюбу (36,7 %). 67,3 % студэнтаў негатыўна ставяцца да фізічных пакаранняў, а 83,2 % юнакоў і 91,8 % дзяўчат плануюць выхоўваць дзяцей па мадэлі супрацоўніцтва – накіроўваць, даючы дзіцяці самастойны выбар. Студэнты негатыўна ставяцца да здрад у шлюбе, аднак 83 % станоўча ставяцца да выпрабавальнага шлюбу.

Траціна рэспандэнтаў 33,7 % лічаць, што аборты дапушчальныя. Юнакі больш катэгарычныя ў гэтым пытанні, і 30 % асуджаюць такі ўчынак. Больш за палову (51,4 %) згодныя са сцвярджэннем, што аборт – гэта забойства, 80,6 % лічаць, што рашэнне пра захаванне жыцця ці аборт павінны прымаць абодва партнёры.

### Для чаго патрэбная сям'я?

«Мне было цікава, як студэнты ставяцца да сям'і, бо разуменне традыцыйнай ролі яе змяняецца. Цешыць, што студэнцкая моладзь разумее і лічыць каштоўным такі сацыяльны інстытут. Мне сям'я патрэбная для таго, каб выхоўваць дзяцей, падтрымліваць адзін аднаго, дапамагаць дасягаць жыццёвых мэт членаў сям'і», – гаворыць **Нінэль Ціханава**, адна з тых, хто праводзіў даследаванне.

Здзівіла дзяўчыну і тое, што ў цэлым юнакоў і дзяўчат не турбуе прапаганда ЛГБТ (больш за 50 % рэспандэнтаў), аднак усё-такі 31,1 % юнакоў (кожны трэці) занепакоены дадзеным пытаннем. Ларыса Філінская таксама пракаментавала гэты момант: «Дынаміка даследавання паказвае, што з кожным годам студэнты становяцца больш памяркоўнымі да прадстаўнікоў ЛГБТ-супольнасці. Як паказаў аналіз папярэдніх апытанняў, дзяўчаты больш талерантныя».

Па меркаванні Нінэль, прапаганда ЛГБТ-ідэй праз некалькі гадоў можа прывесці да значнага павелічэння колькасці гомасексуальных пар і да памяншэння ў будучыні нараджальнасці.

### «Сафія» распавядае пра сям'ю

У рамках універсітэта набываць веды пра сямейнае жыццё і бацькоўства хочуць 28,9 % апытаных студэнтаў. Самая цікавая тэма, за якую прагаласавала 33 %, стварэнне камфортнай эмацыйнай атмасферы ў сям'і. На такі запыт адказвае рэспубліканскі праект «Сафія», заснаваны на базе БДУ. Пра мэту і задачы лекцыі распавяла кіраўнік праекта і начальнік аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ **Наталля Ярашэвіч**: «У апошні час інтэрнэт, фільмы і серыялы лідзіруюць сярод крыніц адказаў на шматлікія пытанні для моладзі. Наш праект – здаровая альтэрнатыва, дзе разам з запрошанымі лектарамі маладыя людзі пачынаюць зведваць праўду, бачыць інфармацыйнае насаджэнне ілжэкаштоўнасцяў, адчуваць сілу адзінства ў традыцыйных поглядах. Для стварэння шчаслівай сям'і тыдзень – вельмі мала. Але адзін тыдзень можа дапамагчы ўбачыць аснову для стварэння шчаслівых адносін і разуменне: калі чалавек шчаслівы ў сям'і, ён хутчэй рэалізуецца ў любой сферы. І, што немалаважна, развіццё адбываецца гарманічна, без перакосаў. Шчаслівая сям'я – гэта рашэнне пытанняў не толькі асабістых, але і дзяржаўнага маштабу. Таму так важна надаваць гэтаму адмысловую ўвагу».

20 чэрвеня праект падрыхтаваў бясплатную свабодную сустрэчу з кандыдатам педагагічных навук **Наталляй Кавалёвай** з Арэнбурга на тэму «10 прынцыпаў усвядомленага бацькоўства». На сустрэчы лектар распавяла пра правілы выхавання дзяцей, як пабудаваць шчаслівыя сямейныя адносіны, што такое місія сям'і і як яна ствараецца, у чым розніца роляў мужчыны і жанчыны ў сям'і. Наталля Кавалёва – заснавальнік і дырэктар дабрачыннага фонду «Будзь чалавекам!», стваральніца жаночага клуба «Веста». На асабістым прыкладзе ведае, што такое быць шчаслівай жанчынай, жонкай і мамай.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

25 чэрвеня 2019 года
Падпісана да друку 24.06.2019 г.
Зак. 440. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспр. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***